# ПАЭТЫЧНЫ СІНТАКСІС

Вершаванай мове ўласціва разнастайная будова сказаў і фраз. Гэта з'яўляецца важным сродкам мастацкай выразнасці. Акрамя ўжо вядомай вам антытэзы і паралелізму (кампазіцыйнага прыёму, пры якім дзве падобныя або процілеглыя з'явы раскрываюцца ў параўнанні, паралельна), да паэтычнага сінтаксісу адносяцца ***рытарычныя пытанні***, якія не патрабуюць адказу і нясуць у сабе сцвярджэнне («Хіба на вечар той можна забыцца?»), ***інверсія***, ці парушэнне прамога парадку слоў з мэтай вылучэння галоўнага («Сэрца нязменна хвалюе дакор»), разнастайныя ***паўторы*** ў пачатку ці ў канцы вершаваных радкоў.

***Рэфрэн*** — радок або некалькі радкоў, якія паўтараюцца ў творы ў нязменным выглядзе праз пэўную колькасць строф. У вершы Петруся Броўкі «Пахне чабор...» рэфрэн з'яўляецца яшчэ і падваеннем («пахне чабор, пахне чабор») — так узмацняецца роля мастацкай дэталі (прыемны водар, які выклікае адпаведныя ўспаміны).

? Прывядзіце прыклады паўтораў і рэфрэнаў з вывучаных вамі вершаў і растлумачце іх ролю.

## «З прыродай зліўшыся душой...»

# ПЕЙЗАЖНАЯ ЛІРЫКА

Чалавек заўсёды шукаў у прыродзе нешта сугучнае свайму настрою, сваім перажыванням. І знаходзіў: ці ў радасным журчанні ручайка, ці ў светлай сонечнай раніцы, ці ў сумнай мелодыі восеньскага дажджу. Нават у звыклай змене пор года няцяжка заўважыць вехі чалавечага жыцця: дзяцінства, маладосць, сталасць і старасць.

***Пейзажная лірыка*** перадае ўражанні, пачуцці, выкліканыя з'явамі і малюнкамі прыроды. Чытаючы такія вершы, можна ўявіць знаёмыя карціны родных мясцін, адкрыць у звычайным сапраўдную прыгажосць. Пейзажная лірыка вылучаецца асаблівай маляўнічасцю, зрокавай выразнасцю, багаццем гукапісу — сродкамі, якія дапамагаюць убачыць і адчуць гармонію ў прыродзе.

# Якуб Колас

## 1882–1956



Ён [Якуб Колас] жыў у арганічнай злітнасці з прыродай, цешыўся і захапляўся яе цудоўнымі з'явамі, уважліва прыслухоўваўся да яе жыцця, да шматлікіх таямніц яго, разгаданых і неразгаданых.

*М. Лынькоў*

*(Урывак з паэмы «Сымон-музыка»)*

* * *

О, край родны, край прыгожы!<br>
Мілы кут маіх дзядоў!<br>
Што мілей у свеце божым<br>
Гэтых светлых берагоў,<br>
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,<br>
Дзе бары-лясы гудуць,<br>
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,<br>
Нівы гутаркі вядуць;<br>
Гэтых гмахаў[1] безгранічных<br>
Балатоў тваіх, азёр,<br>
Дзе пад гоман хваль крынічных<br>
Думкі думае прастор;<br>
Дзе увосень плачуць лозы,<br>
Дзе вясной лугі цвітуць,<br>
Дзе шляхом старым бярозы<br>
Адзначаюць гожа пуць?..

?

1. З галоўным героем паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка» вы знаёміліся ў VII класе. Падумайце, ці адпавядае ўрывак «О, край родны, край прыгожы!» характару Сымонкі, яго ўспрыманню прыроды. Ці блізкае такое адчуванне вам?

[1] *Гмах* — велічны будынак, тут: бязмежная прастора.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

2. Як праз пахі, зрокавыя і гукавыя вобразы Якуб Колас стварае атмасферу паўнаты і радасці жыцця?
3. Якія радкі сведчаць пра духоўную сувязь лірычнага героя твора з продкамі, яго любоў да роднай зямлі, замілаванне ёю?
4. Якое значэнне мае эпітэт у выразе *«светлыя берагі»*? Якія яшчэ эпітэты ўжыты ў творы і з якой мэтай?
5. Гэты твор, па сутнасці, з'яўляецца адным разгорнутым пытаннем да чытача. Які адказ вы можаце даць на яго?
6. Зрабіце ілюстрацыю (ці вусны малюнак) да ўрыўка з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». Абгрунтуйце свой выбар вобразаў, колераў, мастацкіх дэталей.



# *Уладзімір Мазго*

## *Нарадзіўся ў 1959 годзе*

Для лірыкі Уладзіміра Мазго, прасякнутай любоўю да роднага краю, характэрны напеўнасць, меладычнасць, пачуццёвая ўзнёсласць.

*Я. Гарадніцкі*

* * *

Я слухаю
мелодыю дажджу,
Які зайграў
на клавішах лістоты
І наталіў,
і акрыліў душу
Лагодным дакрананнем
кожнай ноты.

Я слухаю
мелодыю дажджу,
Стварыў якую
вопытны маэстра.

I вы яе паслухайце,
прашу,
Нібы канцэрт
цудоўнага аркестра.

Я слухаю
мелодыю дажджу,
Які —
і дырыжор,
і выканаўца.
I я сабе
ні кроплі не хлушу,
Што я —
у гэты міг! —
музыказнаўца...

1. Падбярыце эпітэты да словазлучэння *«мелодыя дажджу»*. Як яны раскрываюць ідэю верша Уладзіміра Мазго?
2. Якая метафара ляжыць у аснове твора? Якія яшчэ вобразна-выяўленчыя сродкі вы заўважылі падчас чытання верша?
3. Праз якія эмацыянальна афарбаваныя выразы сцвярджаецца думка пра гармонію чалавека і прыроды?
4. Навошта, на ваш погляд, аўтар «ламае» радкі? Ці маглі з’явы прыроды паўплываць на такую «разбіўку»?
5. Які асноўны кампазіцыйны прыём ужыты ў творы? Чаму менавіта радок *«Я слухаю мелодыю дажджу»* паўтараецца тройчы? Як называецца такі прыём?
6. Ці знаёмы вам мастацкія творы, прысвечаныя з’явам прыроды? Паспрабуйце ўслед за лірычным героем Уладзіміра Мазго на хвіліну стаць музыказнаўцамі. Паслухайце музычную п’есу беларускага кампазітара Аліны Безенсон «Пасля дажджу» і параўнайце яе з вершам Уладзіміра Мазго: ацаніце эмацыянальны настрой твораў, меладычнасць, наяўнасць паўтораў, гукаў, у якіх чуецца падзенне кропель дажджу.



Правообладатель Акадэмія адукацыі